17. *Киштымов, А. Л.* Этапы железнодорожного строительства на Беларуси / А. Л. Киштымов // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 116–143.

18. Церкви, школы и больницы Л[ибаво]-Р[оменской] Ж[елезной] Д[ороги] / МПС. – Минск: Паровая типолитография Х. Я. Дворжецкого, 1901. – 49 с.

19. *Бусько, С. И.* Велосипед в повседневной жизни белорусских губерний (конец XIX – начало XX в.) / С. И. Бусько // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 9 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2014. – С. 22–29.

20. *Яхимович, С. М.* Весь Минск, или Спутник по Минску / С. М. Яхимович. – 1-е изд. – Минск: Типография Фельдмана и Перского, 1911. – 130 с.

21. *Сардаров, А. С.* Путетворение: история и культура белорусских дорог / А. С. Сардаров. – Минск: Беларуская навука, 2009. – 191 с.

**(Дата падачы: 09.02.2023 г.)**

*А. Г. Казак*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*А. У. Кімбар*
Мінскі гарадскі педагагічны каледж, Мінск

*A. Kazak*
Belarusian State University of Economics, Minsk

*A. Kimbar*
SEI «Minsk City Pedagogical College», Minsk

**УДК 371.13(476)(091)”1920/1930”**

# СТАНАЎЛЕННЕ СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў МІНСКУ Ў 1920–1930-Я ГГ.

# THE BECOMING OF SECONDARY SPECIAL PEDAGOGICAL EDUCATION IN MINSK IN THE 1920S – 1930S.

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці фарміравання сістэмы сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі ў Мінску ў 1920-я – 1930-я гг. На аснове дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, матэрыялаў прэсы аналізуецца тэхнічная база, асаблівасці арганізацыі побыту і адукацыйнага працэсу навучэнцаў і навуковы патэнцыял сталічных педагагічных тэхнікумаў. Мэта артыкула – выяўленне на аснове ўпершыню ўведзеных у навуковы зварот дакументаў сутнасных характарыстык функцыянавання педагагічных тэхнікумаў Мінска ў кантэксце грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага жыцця БССР 1920-х – 1930-х гг.*

*Ключавыя словы: Мінскі Беларускі педагагічны тэхнікум; Мінскі Польскі педагагічны тэхнікум; Мінскі Яўрэйскі педагагічны тэхнікум, сярэдняя спецыяльная педагагічная адукацыя.*

*The article examines the features of the formation of the system of secondary special pedagogical education in Minsk in the 1920s and 1930s. On the basis of the documents of the National Archives of the Republic of Belarus, the State Archives of the Minsk region and press materials, the technical base, the peculiarities of the organization of daily life and the educational process of students and the scientific potential of the metropolitan pedagogical technical schools are analyzed. The purpose of the article is to reveal, on the basis of the documents introduced for the first time in scientific circulation, the essential characteristics of the functioning of Minsk pedagogical technical schools in the context of the socio-political, socio-economic, national and cultural life of the BSSR in the 1920s – 1930s.*
*Keywords: Minsk Belarusian Pedagogical College; Minsk Polish Pedagogical College; Minsk Jewish Pedagogical College; secondary special pedagogical education.*

У 1920–1930-я гг. адбываецца станаўленне беларускай савецкай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэм. Адной з праблем, з якой сутыкнулася савецкая ўлада ў Беларусі, быў высокі ўзровень непісьменнасці насельніцтва. У 1920-я гг. пачынае фарміравацца сістэма беларускай савецкай адукацыі.

Адным з істотных элементаў гэтай сістэмы становяцца педагагічныя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Стварэнне сеткі сярэдніх спецыяльных устаноў па тыпу «тэхнікум» было запатрабаванай мерай ва ўмовах аднаўлення народнай гаспадаркі. У тэхнікумах можна было вырашыць праблему падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў для ўстаноў адукацыі больш хутка, чым у вышэйшых навучальных установах. Акрамя таго, арганізацыя дзейнасці тэхнікумаў патрабавала меншых матэрыяльных расходаў [1, с. 35].

У Мінску для забеспячэння настаўніцкімі кадрамі былі створаныя Мінскі Беларускі педагагічны тэхнікум (далей – МБПТ), Мінскі Польскі педагагічны тэхнікум (далей – МППТ) і Мінскі Яўрэйскі педагагічны тэхнікум (далей – МЯПТ).

У айчыннай гістарыяграфіі вывучэнне станаўлення сістэмы сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі ў Мінску не знайшло комплекснага адлюстравання. Некаторыя звесткі пра функцыянаванне МБПТ, пра выпускнікоў і выкладчыкаў дадзенай навучальнай установы змяшчаюцца ў калектыўнай манаграфіі «Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945 гг.)» [2], артыкулах А. М. Каспяровіча і Н. У. Каспяровіч [1], Л. У. Маракова [3]. Аўтары названых работ аналізавалі агульныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Савецкай Беларусі 1920-х гг. і не факусіравалі ўвагу на дзейнасці МБПТ.

Асобныя звесткі пра дзейнасць МППТ змяшчаюцца ў даследаваннях, прысвечаных становішчу польскай нацыянальнай меншасці ў БССР (работы беларускага гісторыка В. М. Жука [4], польскіх гісторыкаў А. Бялага [5], М. Іванова [6]). Важная інфармацыя змяшчаецца ў дакументальным выданні І. Раманавай [7], якое выйшла ў 2019 г. У працы прадстаўлены дакументы з фондаў Сакрэтнага аддзела/Спецыяльнага сектара Цэнтральнага камітэта (далей – ЦК) Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (да-

лей – КП(б)Б) 1929–1939 гг., якія таксама адлюстроўваюць асноўныя падзеі з жыцця польскай нацыянальнай меншасці ў Савецкай Беларусі.

Даследаванне сістэмы яўрэйскай адукацыі ў БССР у 1920-я – 1930-я гг. знайшло адлюстраванне ў працах гісторыкаў міжваеннага перыяду. Так, Л. Мышкоўскі [8] надаваў вялікую ўвагу дзейнасці яўрэйскай школы і падрыхтоўцы педагагічных кадраў для гэтых устаноў. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі да вывучэння яўрэйскага грамадска-палітычнага руху ў міжваенны перыяд у сваіх працах звяртаюцца І. А. Пушкін [9] і іншыя даследчыкі. Пры гэтым, функцыянаванне МЯПТ не знаходзіць дастатковага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі.

Мэта дадзенага артыкула – выяўленне на аснове ўпершыню ўведзеных у навуковы абарот дакументаў сутнасных характарыстык дзейнасці педагагічных тэхнікумаў Мінска ў кантэксце грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага жыцця БССР 1920-х гг.

Аналіз архіўных дакументаў, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковы абарот, дае магчымасць не толькі рэканструяваць гісторыю зараджэння сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі ў Мінску, але і дапоўніць агульную карціну нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР. Асноўнымі крыніцамі артыкула сталі дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці.

Час стварэння педагагічных тэхнікумаў у Мінску прыпадае на пачатак 1920-х гг. Так, МБПТ пачаў сваю працу ў кастрычніку 1921 г. Навучальная ўстанова размяшчалася ў двухпавярховым мураваным будынку па вуліцы Захар'еўскай (з 1922 г. – вул. Савецкая), пабудаваным у пачатку 1880-х гг. на сродкі дзяржавы для рэальнага вучылішча. У гады Першай сусветнай вайны памяшканні пуставалі, з восені 1918 г. у іх праводзіліся заняткі Мінскага педагагічнага інстытута, у 1920–1921 гг. – Інстытута народнай адукацыі [10, арк. 64 аб.].

МППТ пачаў сваю дзейнасць у 1922 г. на базе арганізаваных годам раней настаўніцкіх курсаў [11, с. 196]. Курс навучання ў тэхнікуме першапачаткова быў шасцігадовым, потым, па меры павелічэння колькасці сямігадовых польскіх школ, пяцігадовым, а з 1927/1928 навучальнага года – чатырохгадовым. Абітурыенты павінны былі авалодаць ведамі ў рамках сямігадовай школы. Пры гэтым выпускнікі польскай сямігодкі прымаліся без іспытаў, у той час як асобы, якія скончылі беларускія школы, здавалі іспыт па польскай мове [4, с. 44]. З 1926 г. пры тэхнікуме дзейнічала гадавое падрыхтоўчае аддзяленне («рабфак»), выпускнікі якога залічваліся ў навучальную ўстанову без іспытаў [6, s. 233].

У 1920-я гг савецкае кіраўніцтва надавала вялікую ўвагу рабоце з яўрэйскім насельніцтвам Беларусі. Стваралася сетка яўрэйскіх школ. Пры гэтым адзначалася, што паспешлівае адкрыццё яўрэйскіх навучальных устаноў прыводзіла да таго, што на работу ўладкоўваліся настаўнікі і выкладчыкі, якія дагэтуль працавалі ў грамадзянскіх школах «клірыкальна-

сіяністычнага» характару і не адпавядалі ідэалагічным патрабаванням. Для яўрэйскіх настаўнікаў стваралі адмысловыя курсы для перападрыхтоўкі ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі, але гэтыя захады апынуліся недастатковымі [8, с. 34]. У 1920–1921 гг. змяняецца падыход да яўрэйскай школы. Частка школ закрываецца, але пры гэтым у адукацыйнай палітыцы савецкага кіраўніцтва робіцца стаўка на яўрэйскія школы як інструмент барацьбы з хэдэрамі [12, с. 136]. Паўстае пытанне аб неабходнасці стварэння МЯПТ, які павінен быў рыхтаваць яўрэйскія педагагічныя кадры. Тэхнікум размяшчаўся ў двухпавярховым будынку плошчай 484,4 м$^2$, пабудаваным яўрэйскім таварыствам пад Талмуд-Тору па вуліцы Ракаўскай. Адметна, што ўжо ў 1922/1923 навучальным годзе ў тэхнікуме вучыліся яўрэі не толькі са сталіцы, але і з беларускіх паветаў, з Гомеля, Віцебска (у той час уваходзілі ў склад РСФСР); з Ніжняга Ноўгарада (РСФСР), з Белай Царквы (УССР), з Польшчы [13, арк. 54–54 аб.]. Гэта паказвае, што тэхнікум станавіўся адукацыйным цэнтрам для яўрэяў не толькі БССР, але і суседніх рэспублік.

Пры арганізацыі дзейнасці адміністрацыі тэхнікумаў сутыкнуліся з вялікімі матэрыяльнымі праблемамі. Так, стан матэрыяльнай базы МБПТ на працягу 1920-х гг. заставаўся вельмі цяжкім. У кароткай тлумачальнай запісцы, накіраванай дырэкцыяй тэхнікума ў Народны камісарыят асветы (далей – НКА) БССР 17 лютага 1923 г., адзначалася, у прыватнасці, «недастатковае абсталяванне мэбляй»: «Сталы для выкладчыкаў трухлявыя, якія маюць выгляд хламу і якія патрабуюць замены на новыя. У канцылярыі, выкладчыцкай, бібліятэцы і чытальні зусім няма крэслаў, іх замяняюць лаўкі прымітыўнай работы». У дакуменце падкрэслівалася неабходнасць папаўнення фондаў бібліятэкі і матэрыяльнай базы навучальных кабінетаў. Паведамлялася таксама, што студэнты атрымлівалі стыпендыі не грашовымі знакамі, а ў выглядзе прадуктовых пайкоў (у студзені 1923 г. – 150 пайкоў, у лютым – 170 пайкоў). Пайкі размяркоўваліся «толькі паміж тымі, хто найбольш мае патрэбу». Інтэрнат МБПТ быў разлічаны на 60 чалавек, хаця тых, хто меў у ім неабходнасць, было нашмат больш [14, арк. 2–4]. У другой палове 1920-х гг. выкладчыкі тэхнікума спрабавалі замацаваць лабараторны метад выкладання. Але гэтая ініцыятыва сутыкнулася з шэрагам цяжкасцей, якія ў асноўным былі выкліканы кепскім матэрыяльным становішчам (у першую чаргу недахопам падручнікаў) і з арганізацыйнымі праблемамі [15, с. 6].

Матэрыяльнае становішча МППТ таксама было цяжкім. Адсутнічаў шэраг прадметных кабінетаў, адчуваўся недахоп плошчаў, холад у памяшканнях [16, с. 124]. У лісце, падрыхтаваным супрацоўнікамі Польскага бюро ЦК КП(б)Б і накіраваным у ЦК партыі, адзначалася, што будынак тэхнікума (адрас – вул. Савецкая, 14) складаўся з 15 пакояў плошчай 192 м$^2$. Памяшканні былі без вентыляцыі, цёмныя, малапрыдатныя для адукацыйнага працэсу. У кабінетах фізікі і хіміі не хапала не толькі мэблі, але і дошак, іншых вучэбных прылад. Інтэрнат, у якім пражывала 80 чалавек, меў пло-

шчу ўсяго 62 м$^2$, ложкаў і пасцельнай бялізны не хапала. Кухня і сталовая на 114 студэнтаў размяшчаліся на плошчы 11 м$^2$ [5, s. 141–142]. На працягу 1920-х гг. сітуацыя ў лепшы бок кардынальна не мянялася. У справаздачы агульнага сходу ячэйкі КП(б)Б пры МППТ за 1926 г. адзначалася, што фінансаванне навучальнай установы складала 60 % ад неабходнага, будынак меў патрэбу ў капітальным рамонце, колькасць стыпендыятаў была недастатковай [17, арк. 55]. Напярэдадні 1927/1928 навучальнага года дырэктар тэхнікума М. Вайнер быў вымушаны накіраваць у НКА БССР ліст з просьбай не скарачаць бюджэт навучальнай установы ў параўнанні з папярэднім годам [18, арк. 6].

Кіраўніцтва МЯПТ, у склад якога ўваходзілі дырэктар тэхнікума, прадстаўнік педагагічнага савета, старшыня камуністычнай ячэйкі, прадстаўнік выканкама, а таксама адказны сакратар Галоўнага бюро ЦК КПБ, сутыкнулася з аналагічнымі цяжкасцямі. Адсутнічалі элементарныя ўмовы для пражывання і работы. Будынкі не былі прыстасаваныя пад тэхнікум і інтэрнат. Не хапала дапаможнікаў і падручнікаў, кабінеты і лабараторыі былі слаба абсталяваныя для правядзення вучэбных заняткаў. У інтэрнаце не хапала бялізны, адзежы, абутку, было халодна і цесна [13, арк. 9 аб. – 10].

Нягледзячы на даволі складаныя матэрыяльны ўмовы, навучэнцы педагагічных тэхнікумаў былі актыўна ўключаны ў адукацыйны працэс і культурнае жыццё сталіцы. Большая частка выкладчыкаў сумяшчала працу ў МБПТ і ў іншых навуковых і педагагічных установах. У справаздачы супрацоўніка НКА БССР за 1929 г. адзначалася, што тэхнікум з’яўляўся асноўным месцам працы толькі для 6 з 33 выкладчыкаў (гэтая з’ява атрымала назву «гастралёрства») [19, арк. 345].

Многія выкладчыкі МБПТ працавалі ў Інбелкульце і БДУ. Сумяшчальніцтва давала магчымасць выкарыстоўваць у адукацыйным працэсе больш рэсурсаў, укараняць новыя методыкі. Такія выкладчыкі мелі больш высокі навуковы ўзровень, што спрыяла ўсебаковым даследаванням і папулярызацыі навукі сярод навучэнцаў тэхнікума, а таксама пашырэнню іх кругагляду. Напрыклад, быў распрацаваны шэраг экскурсій на розныя аб’екты для азнаямлення навучэнцаў з асаблівасцямі іх работы. М. А. Грамыка і М. В. Азбукін з навуковымі мэтамі арганізоўвалі экскурсіі на балотную станцыю, І. М. Серада ў сувязі з выкладаннем заалогіі – на бойню, арганізоўваліся экскурсіі на электрычную станцыю, у музеі і нават на бровар [10, арк. 78]. З іншага боку, такія выкладчыкі фактычна не прымалі ўдзел у грамадскім жыцці тэхнікума, недастаткова праводзілі працу ў гуртках, не наладжвалі патрэбных сувязей з сельскімі настаўнікамі [19, арк. 345].

У 1920-я гг. МБПТ з’яўляўся адным з буйных цэнтраў культурнага жыцця сталіцы Савецкай Беларусі. Так, М. М. Піятуховіч сумесна з прадстаўніком студэнцтва А. І. Аляксандровічам (у будучыні – вядомы беларускі паэт) узначальваў літаратурны гурток тэхнікума. У справаздачы тэхнікума за 1923/1924 навучальны год апісвалася праца гуртка: «Адзін-два разы на

месяц слухачамі ставяцца спектаклі ў клубе «Беларуская хатка». Звычайным складам наведвальнікаў былі ўсе слухачы тэхнікума і староннія, па запрашэнні, прычым кожны вечар запрашаліся дэлегацыі Яўрэйскага і Польскага педагагічных тэхнікумаў, рабфака ўніверсітэта і прадстаўнікі камсамола. Вечары карысталіся папулярнасцю сярод студэнцкай моладзі» [10, арк. 74 аб.].

Не менш востра пытанне педагагічных кадраў стаяла ў МППТ. У 1924 г. калектыў тэхнікума складаўся з 22 выкладчыкаў, але толькі для двух з іх тэхнікум з’яўляўся асноўным месцам працы. Мовай навучання ў тэхнікуме была польская, аднак двое выкладчыкаў вялі заняткі на беларускай мове, трое – на рускай [16, с. 124–125]. У наступныя гады сітуацыя практычна не змянялася. Адміністрацыя навучальнай установы спрабавала перавесці навучанне цалкам на польскую мову, але праз недахоп прафесійных выкладчыкаў ажыццявіць дадзенае мерапрыемства не атрымалася. У 1926 г. сакратар ячэйкі КП(б)Б пры МППТ, дырэктар Я. Клыс адзначаў: «Мы трымаем курс на польскіх выкладчыкаў, але лепш браць рускага педагога, чым не мець педагога зусім». Асобныя выкладчыкі фізічна не паспявалі з аднаго месца працы на іншае, у выніку чаго даволі часта іх лекцыі зрываліся. Безумоўна, такія з’явы негатыўна адбіваліся на навучальным працэсе [17, арк. 55]. Большасць выкладчыкаў не прымала ўдзелу ў грамадскім жыцці тэхнікума, слаба арыентавалася ў мэтах нацыянальнай палітыкі БССР, цьмяна ўяўляла этнакультурную спецыфіку беларускіх палякаў.

Але нягледзячы на кадравыя і фінансавыя складанасці, МППТ таксама з’яўляўся буйным культурным цэнтрам Мінска. Першая польская літаратурная секцыя была створана ў 1925 г. пры тэхнікуме. У 1928 г. на яе базе была створана Польская секцыя Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, якая аб’ядноўвала 63 польскіх пісьменнікаў і паэтаў [20, с. 45]. Дзякуючы іх старанням 17 жніўня 1931 г. у Мінску прайшоў Першы (і адзіны) з’езд польскіх пралетарскіх пісьменнікаў [6, s. 187]. Навучэнцы і выкладчыкі тэхнікума ўдзельнічалі ў культурна-асветніцкіх мерапрыемствах польскага клуба імя Р. Люксмебург у Мінску [17, арк. 55]. Вялікім поспехам у гледачоў карысталіся выступы аркестра і хору студэнтаў МППТ [21, с. 37–39]. Навучэнцы аказвалі шэфскую дапамогу вёскам з польскім насельніцтвам (дапамога ў сельскагаспадарчых працах, правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў) [22, s. 9], арганізоўвалі пункты па ліквідацыі непісьменнасці [23, s. 4].

Выкладчыкі МЯПТ мелі высокі ўзровень падрыхтоўкі і былі спецыялістамі ў сваёй справе. Дырэктар тэхнікума Л. І. Мышкоўскі, выпускнік Віленскага яўрэйскага настаўніцкага інстытута, выкладаў палітычную эканомію і геаграфію. Выкладчык музыкі Т. А. Шнітман скончыў Варшаўскую кансерваторыю ў 1892 г. М. Я. Палены атрымаў політэхнічную адукацыю ў Германіі [13, арк. 55 аб.].

Навучэнцы тэхнікума паходзілі з рабочага асяроддзя, былі накіраваныя на навучанне партыйнымі, камсамольскімі і прафесійнымі арганізацыямі. Вывучалі батаніку, заалогію, мінералогію, геалогію, геаграфію, фізіку, матэматыку, тэхналогію, яўрэйскую і рускую мовы, палітэканомію, гістарычны матэрыялізм, усеагульную гісторыю, музыку, фізічнае выхаванне, ручную працу і маляванне. Навучанне арганізоўвалася лабараторным метадам. Так, батаніку і аграномію вывучалі на ферме, якая была спецыяльна замацавана за тэхнікумам і знаходзілася ў бліжэйшым лесе [13, арк. 6–6 аб.]. Вопыты па фізіцы, хіміі, прыродазнаўстве праводзіліся як у тэхнікуме, так і ў іншых навучальных установах [13, арк. 57]. Арганізоўваліся экскурсіі на заводы і фабрыкі (напрыклад, былі арганізаваныя чатыры экскурсіі на завод «Энергія», дзве – на электрычную станцыю, дзве – на гарбарню, дзве – на дражджавы завод, 16 – на ферму «Курасоўшчына» [13, арк. 64]). Пры МЯПТ былі арганізаваныя грамадская сталовая, пральня і майстэрні: сталярная, швейная і шавецкая [13, арк. 6 аб.].

На высокім узроўні было арганізавана грамадскае і культурнае жыццё навучэнцаў МЯПТ. У навучальнай установе дзейнічала 18 палітычных гурткоў. Меліся клуб-чытальня і бібліятэка (6 тыс. кніг), пры якіх існавалі драматычны і літаратурны гурткі. Клубная камісія выдавала часопіс, на чытанні якога запрашаліся прадстаўнікі партыйных, савецкіх і прафесійных арганізацый, а таксама мясцовага настаўніцтва [13, арк. 7–7 аб.]. Былі арганізаваныя гурткі па гісторыі партыі, па вывучэнні праграмы партыі, політэхнічны, палітэканамічны, музычны (раяль, скрыпка), па маляванні, два спартыўныя, харавы, шахматны [13, арк. 64 аб.].

У пачатку 1930-х гг. наступае новы этап у нацыянальнай палітыцы савецкай дзяржавы. Згортваецца беларусізацыя, адбываецца пераход да інтэрнацыяналізацыі культурнага жыцця. Пачынаюцца рэпрэсіі ўлад у адносінах да «нацыянал-дэмакратаў». У красавіку 1937 г. Пастановай Савета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б педагагічныя тэхнікумы былі перайменаваныя ў педагагічныя вучылішчы. У тлумачэнні адзначалася, што дадзеныя навучальныя ўстановы не ставілі перад сабой задачы даць навучэнцам тэхнічнай адукацыі [2, с. 399].

Такім чынам, у 1920-я гг. фарміруецца сістэма сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі Мінска, якая была прадстаўлена МБПТ, МППТ і МЯПТ. Дадзеныя навучальныя ўстановы, нягледзячы на няпростае матэрыяльнае становішча, забяспечвалі кваліфікаванымі кадрамі беларускія, польскія і яўрэйскія школы, якія размяшчаліся ў розных рэгіёнах не толькі Савецкай Беларусі, але і суседніх рэспублік. Практычныя і метадалагічныя напрацоўкі выкладчыкаў педагагічных тэхнікумаў заклалі аснову для далейшага развіцця педагагічнай адукацыі ў Мінску. Дадзеныя навучальныя ўстановы з’яўляліся буйнымі культурнымі цэнтрамі, якія далі дарогу ў жыццё цэлай плеядзе таленавітых пісьменнікаў і педагогаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Каспяровіч, А. М.* Развіццё свярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі ў Савецкай Беларусі ў 20-х гг. ХХ стагоддзя / А. М. Каспяровіч, Н. У. Каспяровіч // Педагогическое образование и наука: история и современность (к 95-летию со дня образования БГПУ). – Ч. 1. – Минск, 2009 – С. 35–37.

2. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945 гг.) / М. С. Крот [і інш.]. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 494 с.

3. *Маракоў, Л. У.* Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794–1991: энцыклапедычны даведнік: у 3 т. / Л. У. Маракоў. – Мінск: Athenaeum, 2004. – 534 с.

4. *Жук, В. Н.* Польское национальное меньшинство в БССР (1921–1939 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Н. Жук. – Минск, 2008. – 144 л.

5. *Biały, A.* Mniejszość polska na Białorusi Sowieckiej w latach 1921–1939 / A. Biały. – Przasnysz: Towarzystwo Przyjaciół Ziemi Przasnyskiej, 2018. – 839 s.

6. *Iwanow, M.* Polacy w Związku Radzieckim w latach 1921–1939 / M. Iwanow. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 1990. – 424 s.

7. *Раманава, І.* Улада і грамадства: БССР у 1929–1939 гг. У дакументах Сакрэтнага аддзела / І. Раманава; Асобага сектара ЦК КП(б)Б. – Мінск: Логвінаў, 2019. – 1120 с.

8. *Мышкоўскі, Л.* Жыдоўская асьветная справа ў Беларусі / Л. Мышкоўскі // Асьвета. – 1924. – № 2. – С. 32–37.

9. *Пушкін, І. А.* Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.): манаграфія / І. А. Пушкін. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 319 с.

10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусі (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1430.

11. *Мычко, Ю. В.* Партийно-государственная политика в БССР в отношении польского национального меньшинства / Ю. В. Мычко // Лингвострановедческий аспект в преподавании иностранных языков : материалы Респ. науч.-практ. конф., Минск, 17 марта 2009 г. / редкол.: Н. М. Забавский [и др.]. – Минск, 2009. – С. 193–197.

12. Дасягненні ў культурна-асьветнай працы сярод нацыянальных меншасьцяй БССР к 10-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі // Асьвета. – 1927. – № 7. – С. 135–142.

13. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1437.

14. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1449.

15. У Менскім Беларускім Педагагічным Тэхнікуме // Беларуская справа. – 1926. – 14 траўня. – С. 6.

16. Праца Польскага Педагагічнага Тэхнікуму ў Менску і яе сучасныя вынікі // Асьвета. – 1927. – № 5. – С. 123–125.

17. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 162п. Воп.1. Спр. 211.

18. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 2023.

19. ДАМВ. – Ф. 12п. Воп. 1. Спр. 1086.

20. *Альшэўская, С. І.* Некаторыя аспекты развіцця культуры польскага этнаса ў БССР (міжваенны перыяд) / С. І. Альшэўская, В. А. Йоцюс // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы Междунар. науч.-теорет. конф., г. Минск, 23 июня 2011 г. / редкол.: В. В. Тугай [и др.]. – Минск, 2011. – С. 45–47.

21. Польская школа і польскі настаўнік у Савецкай Беларусі // Асвета. – 1924. – № 2. – С. 37–39.

22. *Parfjanowicz, S.* O pracy stowarzyszenia szefowskiego przy PTP / S. Parfjanowicz // Orka. – 1926. – 27 czerwca. – S. 9.

23. Z murów uczelni – w masy // Orka. – 1928. – 17 października. – S. 4.


**(Дата падачы: 27.02.2023 г.)**